*Секцыя 4*

**ТРАДЫЦЫЙНАЯ КУЛЬТУРА Ў КНІЗЕ, АДУКАЦЫЙНАЙ ПРАСТОРЫ І АРТТЭРАПІІ**

*Ганна Барвенава*

## КУНТУШОВА-ЖУПАНОВЫ СТРОЙ, БАЛЫ І ВЯСЕЛЛІ

Доля шляхты ў беларускім грамадстве традыцыйна складае каля 10–15 % насельніцтва. Гэта дэманструюць, акрамя пісьмовых крыніц, працэнт удзельнікаў паўстанняў, трыманне за зямлю і маёнтак, сямейныя і рэлігійныя святы, прыхільнасці выбаршчыкаў і многае іншае. Нягледзячы на нешматлікасць, менавіта традыцыі шляхты з часоў аднаўлення незалежнасці Беларусі сталі прыцягваць да сябе ўвагу кіраўніцтва дзяржавы, мастакоў, кіраўнікоў мастацкіх калектываў, рэжысёраў, грамадзян. Уласны маёнтак, «замкавы» экстэр'ер, якасць строю, музыка, балы, танцы, забавы і іншыя атрыбуты шляхецкага жыцця пачалі паступова адраджацца. Аднаўляецца адвечнае суіснаванне шляхецкай і традыцыйнай вясковай культур.

100 год таму як пра сённяшні час напісана Міронам Браніславам Нарбутам (паўстанец 1863 г., стрыечны брат Людвіка і пляменнік Тэадора Нарбутаў) у творы «Шляхта ваколічная»: «Грамадства шляхецкае: дзяды, бацька з дарослымі сынамі, дачка з малымі дзецьмі, усе разам працуюць, уласнымі рукамі абрабляюць частку зямлі, перайшоўшую ім у спадчыну, што іх корміць і якую яны любяць. Рэдка шляхціц прадае сваю сялібу, хоць бы яму і добра абяцалі заплаціць. Раскоша для яе чужая, патрэбы абмежаваныя. ... Старанны шляхціц меў добры запас грошай, што згодна са старадаўнім звычаем змяшчаў пад працэнты ў больш заможнага грамадзяніна, не даючы веры ашчаднаму банку і іншым крэдытным расійскім інстытутам. У такой шляхецкай сям'і заўсёды панавалі адзінства і спакой. Простая шчырая вера, пабожнасць і гасціннасць, любоў да роднай зямлі – гэта ва ўсе часы адметныя рысы засцянковага шляхціца. … З памяццю ад дзядоў і бацькоў пра свае даўнейшыя свабоды і роўнасці грамадзянскія, шляхта засяродзілася ў сабе і старанна захоўвала ў сваіх сэрцах ва ўсіх пакаленнях любоў да Айчыны і дух служэння ёй, а ў звычаях хатніх – народныя традыцыі з даўніны. Не зламаны пераследам дух неаднойчы ўзбуджаў пашану ў саміх маскалёў» [1].

Адной з важнейшых знешніх адметнасцей шляхты, якую дэманструюць шматлікія творы мастацтва і падкрэсліваюць амаль усе даследчыкі, быў кунтушова-жупановы строй, а «шляхцянкі носяць сукенкі..., чапцы, капелюшы і ніцяныя пальчаткі. Паненкі галаву не пакрываюць». 300 гадоў магнат і шляхціц апранаў на Сейм, ўсе дзяржаўныя і сямейныя святы жупан, падвязаны поясам, і паверх яго кунтуш. Аднойчы князь Караль Радзівіл, Пане Каханку, прыйшоў на Сейм у белым некалі жупане, паверх якога красаваўся кунтуш, выцерты дашчэнту. А калі атрымаў заўвагу пра знешні выгляд ад Аўгуста Панятоўскага, з гонарам адказаў: «Ваша каралеўская мосць, гэты кунтуш носіць ужо трынаццаты па чарзе Радзівіл, калі становіцца віленскім ваяводаю, таму і ня дзіва, што ў яго такі выгляд» [2, с. 106]. Гэта быў публічны намёк на «маладосць» роду Панятоўскіх, а таксама выразны доказ спадчыннасці шляхецкага строю. Нават у пачатку XX ст. шляхта фатаграфавалася ў кунтушова-жупановым строі, падкрэсліваючы адвечныя гонар, годнасць і свабоду.

За 25 гадоў аднаўлення незалежнасці Беларусі шляхецкі строй стаў пазнавальным і родным для беларуса дзякуючы дзяржаўным праграмам (аднаўленне слуцкага пояса), творчасці дзяржаўных і аматарскіх калектываў («Харошкі», «Тутэйшая шляхта» і інш.), музейным экспазіцыям (Мірскі замак, Нясвіжская ратуша, Музей гісторыі Магілёва, Слуцкі краязнаўчы музей і інш.), маркам і манетам. Дзякуючы мастаку, навукоўцу Юрыю Піскуну матэрыялізаваная шляхта, увасобленая «Харошкамі», прадэманстравала шыкоўнасць беларускай спадчыны, гонар, самадастатковасць яе стваральнікаў. Менавіта мастацкі вобраз, створаны Юрыем Піскуном і Валянцінай Гаявой, вобразы балю, палявання, заляцання сталі яскравай ілюстрацыяй шляхецкай Беларусі.

Працэс захаплення, асэнсавання і адраджэння шляхецкай культуры ідзе на розных узроўнях грамадства: кнігі, альбомы, тэматычныя выставы, тэлевізійныя перадачы, рыцарскія клубы і турніры, грамадскія аб'яднанні («Згуртаванне Беларускай Шляхты», «Спадчыннікі шляхты і дваранства» і інш.), калядныя, выпускныя балі, вяселлі і многае іншае (мал. 1). Акрамя строю, адраджаюцца культура паводзінаў, захапленне роднай гісторыяй, культурай, мовай, музыкай і музычнымі інструментамі, танцамі і ліцвінскай кухняй. «Танцы шляхты – гэта ўжо не скокі і матляханні, а паланэз, англес, вальс, галопада, часам мазурка і овертас. Апрача набожных песень, калі надыйдзе вясёлая пара, з прыемнасцю можна паслухаць песні, што спяваюць мужчыны: «Курдэш над Курдэшамі», «Сядзіць заяц пад мядзведзем» і іншыя, альбо паненка заспявае: «Выйдзі, выйдзі прыгожая з хаткі», «Тыя некалькі бяроз», «Чаго вочкі заплакала», «Страціўшы шчыгла» і т.п., якія для патрыёта роднай зямлі з'яўляюцца ўзорам тэксту, і мелодыі» [1].

Некалькі фактаў працэсу адраджэння шляхецкай культуры і строяў. 15 снежня 2013 года ў Мінску прайшла культурна-гістарычная канферэнцыя, прысвечаная 150-годдзю паўстання 1863 года пад

РЭПОЗІТОРЫЙ БГУКИ

кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага. На мерапрыемстве быў таксама прэзентаваны адноўлены шляхецкі ўбор з Ашмяншчыны і сялянскі касцюм з Піншчыны. Канферэнцыя прайшла пад акампанемент струннай музыкі шляхецкіх двароў сярэдзіны XIX ст. ў выкананні капэлы музыканта і мастака Алеся Ліся. «У часы Вялікага княства Літоўскага музыка была ўзнёслай і ўрачыстай, яна выхоўвала густ і несла эмоцыі годнасці», – адзначыў Алесь Лось [3]. Салоны, балы, свецкія мерапрыемствы ў шляхецкіх кунтушах і жаночых капелюшах практыкуюць грамадскія арганізацыі [4].

Аднаўляецца культура шляхецкага адпачынку. «Шляхецкі год» – «Шляхецкая баля», «Рэдут», «Касіна» завяршыў ампірны «пікнік» ў Музеі-сядзібе І. Рэпіна «Здраўнёва» (20 чэрвеня 2013 г.) [5]. На пікніках бавяцца ў гульні шляхты: «Парсючок», «Габрэй», «Канатаходзец», шашкі, кракет і не толькі. Дамы і кавалеры абавязкова ў шляхецкіх строях частуюцца гарбатай, напаўняюць «свецкі альбом» малюнкамі і вершамі. На святах існуе «дрэс-код», моўны код, аднаўляецца атмасфера XIX ст., адраджаецца адчуванне ўнутранай свабоды, гонару, самадастатковасці (мал. 2). Кожнае свята грунтоўна рыхтуецца: праводзяцца кансультацыі з навукоўцамі, штудзіруецца літаратура, распаўсюджваецца падрабязнае апісанне правілаў гульні і інш. Шляхецкія святы ў Віцебску і рэгіёне адраджаюцца дзякуючы шматгадовай апантанай працы Элы Петрачэнкі (кіраўнік клуба культурна-гістарычнай рэканструкцыі «Паўночная вежа» турысцка-музейнага комплексу «Залатое кола. Віцебск»), Крысціны Бондаравай (каардынатар праграм моладзевага грамадскага аб'яднання «Гісторыка» па Віцебскай вобласці, педагог-арганізатар «Беларускага тэатра «Лялька»), Сяргею Шыдлоўскаму (дацэнт Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта).

Варта заўважыць, што шляхецкі кунтушова-жупановы строй суіснаваў з модным еўрапейскім. Выразны прыклад: князь Януш Радзівіл адлюстраваны на партрэтах 1630 і 1650 гадоў у абодвух варыянтах строяў [6, іл. 129, 136]. Але калі ў канцы XVIII ст. французскія касцюмы запаланілі рынак, іншаземнай модзе заканадаўча супрацьстаялі: быў уведзены фармальны святочны шляхецкі строй. На Сейме 1776 г. ухвалілі абавязковыя для паслоў ваяводскія строі, дакладней былі зафіксаваны колеры кунтушоў і жупаноў, якія прапаноўваліся для абмеркавання ў ваяводствах. На Сейм у 1778 г. паслы ўжо прыбылі ў строях тых колераў, якія былі зацверджаны ваяводствамі:

woj. Wileńskie: kontusz granatowy, wyłogi i żupan karmazynowe;
woj. Trockie: kontusz szkarłatny, wyłogi zielone, żupan biały;
woj. Kijowskie: kontusz turkusowy z wyłogami czarnemi, żupan biały;
woj. Smoleńskie: kontusz karmazynowy, wyłogi i żupan granatowe;
woj. Nowogródzkie: kontusz szkarłatny, żupan i wyłogi czarne;
woj. Brzeskie-litewskie: kontusz szafirowy, wyłogi karmazynowe, żupan i pas biały;
woj. Mińskie: kontusz karmazynowy, żupan i wyłogi granatowe.

Паслы Мінскага ваяводства былі апранутыя ў пурпурны (малінавы) кунтуш, цёмна-сіні жупан і штрыфлі (лацканы, бартавіны, закаўраш).



*Малюнак 1* – Сучаснае беларускае вяселле. Строй



*Малюнак 2* – Шляхецкія гульні і пікнік у Здраўнёва

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

маладога: кунтуш, жупан, пас, шабля-карабэла,
боты на абцасах

Апошняе масавае выкарыстанне шляхецкага строю – жупан і кунтуш,назіралася ў міжваенны перыяд, асабліва на сямейных урачыстасцях магнатэрыі і шляхты: вяселлі, калядныя сустрэчы, пахаванні. Малады быў апрануты ў жупан, кунтуш, шляхецкую шапку з пяром. На баку – абсыпаная каштоўнымі камянямі шабля-карабэла. Шаноўныя госці таксама ў жупанах і кунтушах, з шаблямі. Маладая апранала сучасную для свайго часу сукенку, а паверх кунтушык, аздоблены белым футрам. У сучаснай Беларусі аднаўляюцца вяселлі ў шляхецкім стылі (мал. 1). Малады – ў кунтушова-жупановым шляхецкім строі, нават з шабляй, маладая – ў стылізаваным гістарычным строі, традыцыйныя музыкі і ліцвінская кухня ўжо займаюць сваё пачэснае месца [7]. Заўважым, што да шляхецкіх традыцый звяртаецца пераважна інтэлігенцыя.

Варта ведаць, што погляд на аднаўленне традыцый беларускай шляхты, неадназначны з боку суседзяў. Са здзіўленнем прачытала, што «сарматизм есть философия социального расизма, когда народ выводится за рамки человеческого рода в категорию «скота-быдла». В Речи Посполитой простой народ (крестьяне и мещане) пребывал в положении говорящей скотины и рассматривался как объект ничем не ограниченной эксплуатации. Так относилась шляхта в равной степени и к полякам, и к русскому православному населению Западной Руси (Белоруссия и Украина). Сарматизм пустил глубокие корни не только в Польше, но и на Украине, и в Белоруссии. На Украине неосарматизм отчасти проявляется в «украинстве», а в Белоруссии в литвинстве. Многие в Белоруссии недооценивают опасность литвинства, считая его маргинальным течением. Но достаточно посмотреть, как оно постепенно проникает в среду творческой интеллигенции, и станет очевидным, что литвинство постепенно зреет как философия «новой шляхты». Когда-то был прекрасный коллектив белорусского народного танца и песни «Хорошки». Сейчас танцоры одевают сарматские жупаны и чинно шествуют в торжественном полонезе. Зачем-то пытаются убедить белорусов в том, что панские танцы – это и есть белорусская культура. Огромные деньги вкладываются в реставрацию Радзивиловского замка как памятника белорусской архитектуры, выпускается черный хлеб под маркой «Радзивиловский», в бывший универсам в Минске перестраивается под новым названием «Радзивиловский».
Далей у цытаце варта звярнуць увагу на выстрайванне акцэнтаў, у тым ліку праз напісанне прозвішчаў магнатаў з маленькай літары, а «рускага» з вялікай: «Очевидно, что существуют силы, которые последовательно прививают неосарматизм-литвинство в Белоруссии как идеологию «новой шляхты», которая будет враждебна как русскому началу белорусов, так и всему Русскому миру, Православию и славянству. Пока еще не взошли уже посеянные зёрна литвинства-сарматизма, белорусскому обществу следует бдительнее относиться к «шляхетским танцам», наследию радзивилов с сапегами, и прочим историческим фальсификациям. Неосарматизм-литвинство является серьёзной угрозой будущему белорусов и его подлинному суверенитету» [8].





РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Малалюнак 3* – Касцюм стральца страмяннога палка цара Аляксея Міхайлавіча. Герцаг Георгій Мекленбург-Стрэліцкі. Касцюм баярыні дапятроўскага часу. Княгіня Алена Галіцына. Баль, Расія 1903 г.

Рыторыка прыведзенай шырокай цытаты выразна паказвае стаўленне звонку да адраджэння беларускай культуры. Беларускія дзяржаўныя ўстановы спрыяюць адраджэнню слуцкіх паясоў як брэнда Беларусі, аднаўленню замкаў і палацаў, гістарычных назваў. Адраджэнне вітаецца інтэлігенцыяй, успрымаецца беларусамі як крэўнае, а блізкія суседзі ўспрымаць гэта як пагрозу «всему Русскому миру».

Чаму можа так хваляваць элемент шляхецкага строю – слуцкі пояс або хлеб «Радзівілаўскі»? Элемент строю, строй пэўнай гістарычнай эпохі, а столькі асацыяцый? Чаму біблейскія персанажы на творах мастацтва, апранутыя ў шляхетныя строі эпохі готыкі, Рэнесансу, жывуць у тагачасных інтэр'ерах? Выбітныя мастакі розных эпох візуалізізавалі вечнасць сусветных ідэй, запаведзяў, чалавечнасць біблейскіх асоб, блізкасць іх да сучаснікаў. Навошта праз 300–500–1000 год на дзяржаўныя і сямейныя святы ў многіх краінах свету апранаюцца гістарычныя строі і ўпрыгажэнні: дыядэма, мантыя, кунтуш, кілт, сары... Строй з'яўляецца выразным паказчыкам прыналежнасці да нацыі, ілюстрацыяй гісторыі, сувязі пакаленняў.

Адзін з выразных прыкладаў: 111 гадоў таму 13 лютага 1903 г. Раманавы далі апошні ў гісторыі імператарскай Расіі касцюміраваны баль. У запрашэннях, разасланых гасцям, асноўным патрабаваннем было з'явіцца на баль у касцюмах XVII ст. [9]. Менавіта гэты баль называюць апошнім балем Імперыі, своеасаблівым развітаннем з мінулым, апошнім «бывай!» старой Расіі. «Впечатление получилось сказочное, – писал очевидец события, – от массы старинных национальных костюмов, богато украшенных редкими мехами, великолепными бриллиантами, жемчугами и самоцветными камнями, по большей части в старинных оправах...». У 1904 г. быў выпушчаны спецыяльны альбом «Костюмированный бал в Зимнем дворце», які змяшчаў 21 гравюру і 174 фотатыпаў. Апошні расійскі імператар на балі быў апрануты ў адзенне свайго першага царскага продка Аляксея Міхайлавіча, імператрыца Аляксандра Фёдараўна адпаведна была апранутая ў строй жонкі Аляксея Міхайлавіча – царыцы Марыі Ілінічны. Уплыў сучаснай на той час моды назіраўся пераважна ў мужчынскіх вобразах: сакольнік, стралец і іншыя чыны дапятроўскага часу з закручанымі вусамі і маленькімі барадамі не хадзілі. Але важна галоўнае – тэмай рускага балю былі абраныя дапятроўскія часы і строі.

Сёння Расія стварае вобраз моцнай бясконцай імперыі дзякуючы строям, стылізаваным пад вайсковыя строі 1812 года, што візуальна нагадвае пра пераможнае шэсце па Еўропе. На другі план адышлі строі, якія абірала папярэдняя імперыя – стараруcкія строі дапятроўскай эпохі. Іх паэтызавалі таксама кінаіндустрыя, выяўленчае мастацтва часоў СССР.




*Малюнак 4* – Шляхецкія кунтушова-жупановыя строі і шаблі-карабэлы. Вяселле на Віленшчыне. Пачатак XX ст.

На тэрыторыі Беларусі ўзлёты шляхецкай культуры адбываліся паміж паўстаннямі, войнамі, гартуючы дух шляхціца (мал. 4). Мірон Нарбут у згаданым творы апісваў: «У вязні ў Вільні ў кляштары св. Пятра бачыў шляхціца засцянковага з-пад Ліды Стэфана Вільбіка. Ён набіраў самаахотнікаў да аддзелаў Людвіка Нарбута ў Лідскім павеце і даставляў жывёлу. Павязаны расейцамі з мандатам Ураду Народнага,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

асуджаны быў і ў вязніцы аддадзены пад ваенны суд. Захоўваў поўны спакой і моцную волю і нікога не скампраментаваў. У калегі па вязніцы Вільбік пытаўся: «Скажы, Пан, які можа мне быць дэкрэт?». «Могуць павесіць,» – той адказаў. Задумаўся трошкі Вільбік, але праз хвіліну спытаў: «А чы я буду ў гісторыі?». «Абавязкова – гісторыя пераказвае нашчадкам імёны ўсіх, хто заслужыў ў Айчыны,» – адказаў той. На што Вільбік з усёй энэргіяй выказаў: «Хвала Богу – няхай вешаюць!». [1].

Шляхецтва-ліцвінства-сарматызм як моцная ідэалагічная база мае цэлае кола сімвалаў, сярод якіх строй, святочная і рэлігійная культура, музыка. Зварот да пласта шляхецкай культуры на розных узроўнях беларускага грамадства паказвае грунтоўнасць і жывучасць шляхецкай ідэалогіі і культуры, патрэбы сучаснага грамадства, імкненне да адраджэння шляхецкай годнасці, вольнасці, самадастатковасці.

**Спіс літаратуры:**


1. Нарбут, М. Б. Шляхта ваколічная / М. Б. Нарбут [Электронны рэсурс]. – Режим доступа : http://pawet.net/memoirs/narbut/shlachta.
2. Казлоў, Л. Р. З дазволу караля і вялікага князя / Л. Р. Казлоў. – Мінск : АРТЫ-ФЭКС, 1998. – 112 с.
3. Костюмы повстанцев 1863 года и шляхетская музыка XIX века презентованы на конференции к 150-летию восстания Кастуся Калиновского / БелаПАН [Электронны рэсурс]. – Режим доступа : http://belapan.com /archive/2013/12/16 /media_18634.
4. Наследники шляхты в Беларуси: "Мы отличаемся благородной внешностью и хорошими манерами" [Электронны рэсурс]. – Режим доступа : http: //news.tut.by/society/376141.html
5. Пукшанский, А. Первый шляхецкий ампирный «пикник» в Музее-усадьбе И. Е. Репина / А. Пукшанский // Звязда. – 2012. – 20 июня ; Режим доступа : http: //zvyazda.minsk.by/ru/archive/article.php?id=98838&idate=2012-06-20.
6. Жывапіс Беларусі XII – XVIII стст. / аўт. уступ. тэксту Н. Ф. Высоцкая; склад. : Высоцкая Н. Ф., Карповіч Т. А. – Мінск : Беларусь, 1980. – 315 с.
7. Молодая пара из Минска сыграла свадьбу в шляхецком стиле [Электронны рэсурс]. – Режим доступа : http: //people.onliner.by/2013/08/14/ svad.
8. Зеленковский, И. Жизнь Анджея Леппера – борьба славянина против сарматизма / И. Зенленковский [Электронны рэсурс]. – Режим доступа : _http: // zapadrus.su/bibli/geobib/2011-08-03-16-33-54/416-xxi-58.html.

Последний бал империи [Электронны рэсурс]. – Режим доступа : http: //vestnikk.ru/dosug /legends/4439-posledniy-bal-imperii.html.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ